УДК 908(476)(091)

А. У. Дзянісаў, аспірант

# ПАЛІТЫКА ЎЛАДАЎ У ДАЧЫНЕННІ ДА ДОБРААХВОТНЫХ КРАЯЗНАЎЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ У БЕЛАРУСІ Ў 1920–1923 ГГ.

Article addresses the problem of the relationship of Soviet authorities and voluntary organizations in local history during the years 1920–1923 in the BSSR. The theme of public policy with regard to local history societies is not explored before. This period is characterized on the one hand was the desire of the authorities to put local history voluntary organization under tight control. On the other hand, it was the desire of the authorities to steer local history societies to address the economic challenges. These processes are well shown by the example of the activities of the Minsk Society of History and Antiquities.

**Уводзіны.** Палітыка Савецкай улады ў дачыненні да добраахвотных краязнаўчых арганізацый на Беларусі ў перыяд 1920–1923 гг. вылучаецца сваёй недаследаванасцю. Разам з тым гэтая тэма ўяўляе вялікую цікавасць для даследавання развіцця краязнаўчага руху ў 20-я гг. XX ст. Некаторыя аспекты дадзенай тэмы, а дакладней дзейнасць Мінскага таварыства гісторыі і старажытнасцяў, закраналі ў сваіх працах даследчыкі В. С. Вяргей і Л. В. Аляксееў [1, 2]. Разам з тым механізмы, нарматыўныя дакументы, рэгулюючыя дзейнасць Мінскага таварыства гісторыі і старажынасцяў, як і іншых добраахвотных краязнаўчых арганізацый, былі пакінуты без ўвагі. На сучасны момант, пасля ўводу ў навуковы абарот малавядомых крыніц, гэтыя механізмы ўяўляюць значную цікавасць для навуковай грамадскасці.

**Асноўная частка.** У перыяд пасля падзей Кастрычніцкай рэвалюцыі да пачатку 20-х гг. ва ўмовах фарміравання новай Савецкай дзяржавы дзейнічалі добраахвотныя грамадскія арганізацыі, якія дастаткова актыўна займаліся краязнаўчай дзейнасцю. Галоўную ролю ў дзейнасці такіх арганізацый адыгрывалі прадстаўнікі інтэлігенцыі. Гэтая актыўнасць асабліва праявілася ў тых ўмовах, калі вялікая колькасць помнікаў культуры, гісторыі аказалася ў небяспецы, шмат было знішчана пад час падзей грамадзянскай вайны або знаходзілася ў крытычным стане.

Але не толькі выратаванне і захаванне культурнай спадчыны зрабілася галоўнай задачай краязнаўцаў. Краязнаўчая дзейнасць разглядалася Савецкімі уладамі як адна з магчымасцяў пераадолення эканамічнага крызісу. Мясцовыя даследчыкі, якія валодалі неабходнымі ведамі і навыкамі, безумоўна, маглі знайсці шляхі больш аптымальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў краіны, дапамагаючы тым самым паляпшэнню эканамічнага стану ў многіх сферах эканомікі.

1918–1922 гг. сталі часам фарміравання асноў палітыкі Савецкай дзяржавы ў адносінах да грамадскіх арганізацый і навуковых таварыстваў. Тады быў выдадзены шэраг дэкрэтаў і інструкцый СНК РСФСР, у якіх быў адлюстраваны парадак стварэння і дзейнасці краязнаўчых таварыстваў. Галоўнай мэтай гэтых актаў стала імкненне стварыць функцыянальную сістэму кіраўніцтва і кантролю дзейнасці таварыстваў, якія займаліся вывучэннем краю. Не абмінулі гэтыя тэндэнцыі і Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку Беларусь (ССРБ). Узаемаадносіны Савецкіх органаў улады і добраахвотных краязнаўчых арганізацый, з аднаго боку, развіваліся ў агульнасаюзных ўмовах, з іншага – мелі свае адметнасці.

На Беларусі ў 1919–1923 гг. краязнаўчай працай займаліся Мінскае таварыства гісторыі і старажытнасцяў, Беларускае вольна-эканамічнае таварыства, Мінскае педагагічнае таварыства, Віцебскае таварыства краязнаўства, Слуцкая павятовая камісія беларусазнаўства, Гурток вывучэння Гомельшчыны, Смалярскі гурток краязнаўства, Хутарскі валасны гурток краязнаўства і інш. [3, 4]. Большасць актыўных членаў краязнаўчых таварystваў на месцах складалі прадстаўнікі нацыянальнай інтэлігенцыі, пераважна настаўніцтва, якое заўсёды цікавілася даследаваннямі роднага краю. Нягледзячы на ўмовы цяжкага эканамічнага становішча, іх дзейнасць мела даволі значныя вынікі.

Галоўную ролю сярод беларускіх краязнаўчых арганізацый адыгрывала Мінскае таварыства гісторыі і старажытнасцяў. Мінскае таварыства гісторыі і старажытнасцяў ўзнікла ў 1919 г., аднак распачаць дзейнасць змагло толькі ў 1920 г. У перыяд акупацыі Мінска польскімі войскамі была зроблена спроба легалізацыі стану таварыства. Статут таварыства быў прадстаўлены кіраўніцтву Мінскай акругі, аднак не атрымаў там падтрымкі. З усталяваннем Савецкай улады статут таварыства быў зацверджаны 28 снежня 1920 г. намеснікам народнага камісара асветы ССРБ І. І. Карэнеўскім [5, с. 40].

Адкрыццё таварыства супала з прыездам ў Мінск членаў камісіі па адкрыцці Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Першы збор 30 снежня 1920 г. адбыўся ў памяшканні Інстытута Народнай адукацыі, прысутнічала каля 400 чалавек. На першых пасяджэннях ад Беларускага навукова-культурнага таварыства ў Маскве прысутнічаў прафесар У. І. Пічэта. У часовае кіраўніцтва ўвайшлі М. Г. Маслаковец (старшыня,

выкладчык Мінскай школы № 2), Н. Г. Сцепуржінскі і І. П. Поляк [5].

Для рэгістрацыі і супрацоўніцтва таварыства прадставіла ў Наркамат асветы ССРБ і Акадэмічны цэнтр свой статут, дакументацыю і інш. Мінскае таварыства гісторыі і старажытнасцей запрасіла ў Наркамата асветы ССРБ на вядзенне даследчых і экспедыцыйных работ суму каля 5 000 000 руб. Наркаматам было выдзелена толькі 2 000 000 руб. [6, арк. 2–5]. Гэтых сродкаў было недастаткова, аднак нягледзячы на гэта таварыства змагло часткова рэалізаваць свае планы. Першымі крокамі таварыства было распаўсюджванне апытальных лістоў сярод мясцовых навучальных ўстаноў (школ) і культурных працаўнікоў. Апытальныя лісты змяшчалі пункты з пытаннямі, якія тычыліся прадметаў старасвеччыны. З дапамогай іх таварыства намагалася атрымаць звесткі з розных месцаў Беларусі аб помніках (замчышчы, курганы, храмы), стану мясцовых музеяў, архіваў і калекцый прадметаў старажытнасці, гістарычных дакументах. Аднак, з-за адсутнасці фінансавых сродкаў, распаўсюджванне адбылося не ў поўнай меры [4].

На пасяджэннях таварыства летам 1921 г. было вырашана накіраваць камісію для даследавання мястэчка Ізяслаўль (суч. Заслаўе) на чале з М. Г. Маслакоўцам. Пасля пробных раскопак камісія з 28 жніўня ажыццявіла поўнамаштабнае археалагічнае даследаванне, якое ахапіла не толькі тэрыторыю мястэчка, але і яго навакольныя мясцовасці. Дзякуючы гэтаму ўдалося даследаваць шматлікія курганы і старажытнае гарадзішча. Камісія даследавала і архіўныя матэрыялы Ізяслаўля. Вынікі раскопак і збораў былі прадстаўлены грамадскасці Ізяслаўля, якая праявіла вялікую цікавасць, у таварыства паступілі заяўкі і прапановы супрацоўніцтва [5, с. 40]. На жаль, на наступны 1922 г. з прычыны адсутнасці сродкаў даследаванні вырашана было прыпыніць [4].

У снежні 1921 г. у Маскве адбылася першая Усерасійская краязнаўчая канферэнцыя, на якой разглядаліся важнейшыя пытанні расійскага краязнаўчага руху – характар, накірунак, формы і метады работы краязнаўчых арганізацый. На гэтай канферэнцыі было сфарміравана Цэнтральнае бюро краязнаўства РСФСР, якое пачало ажыццяўляць кіраванне краязнаўчым рухам у Расіі. Пачаў выдавацца часопіс «Краязнаўства». На гэтай канферэнцыі яскрава былі паказаны памкненні савецкіх уладаў накіраваць вялікі энтузіязм краязнаўчых таварystваў на карысць сацыялістычнаму будаўніцтву. Адначасова былі сфарміраваны і прынцыпы новага савецкага краязнаўства – усебаковае, комплекснае навуковае вывучэнне пэўнай тэрыторыі, горада, вёскі ці іншага аб’екта пераважна мясцовымі сіламі. Асноўная ўвага надавалася сацыяльна-эканамічным і прыродным фактарам, вынікі даследаванняў якіх маглі быць скарыстаны на карысць сацыялістычнага будаўніцтва. Разам з тым не былі пакінуты і помнікі культуры і старажытнасці як дзяржаўныя каштоўнасці [7].

Спачатку ідэя аб’яднання краязнаўчых таварыстваў Беларусі прагучала на пасяджэннях Мінскага таварыства гісторыі і старажытнасцяў [6, арк. 21]. На пачатак 1922 г. у праўленне таварыства ўваходзілі прафесар У. І. Пічэта (старшыня), М. Г. Маслаковец (сакратар), І. П. Поляк, працягвалі актыўна супрацоўнічаць Е. Ф. Карскі, Ф. Ф.Турук, В.М. Ігнатоўскі, М. І. Каспяровіч і інш. 10 студзеня 1922 г. адбыўся аб’яднаны сход прадстаўнікоў Беларускага вольна-эканамічнага, Мінскага педагагічнага таварыства і Мінскага таварыства гісторыі і старажытнасцяў. На сходзе быў заслуханы даклад аб Першай краязнаўчай канферэнцыі і абмеркаваныя яе вынікі. Было пастаноўлена дaручыць аб’яднанаму праўленню таварыстваў прыняць меры па скліканні Агульнабеларускай канферэнцыі краязнаўчых таварыстваў. Было створана і Часовае бюро краязнаўства, у якое увайшлі прадстаўнікі аб’яднанага праўлення. На канферэнцыі планавалася выпрацаваць асноўныя напрамкі дзейнасці краязнаўчых таварыстваў па вывучэнні Беларусі [6, арк. 21].

Аднак Народным камісарыятам асветы не быў дадзены дазвол на яе скліканне. Фармальнай падставай для адмовы з’явілася адсутнасць фінансавых сродкаў на правядзенне канферэнцыі. У сувязі з гэтым часовае бюро было расфарміравана, актыўнасць таварыстваў знізілася [4].

3 жніўня 1922 г. Усерасійскі цэнтральным выканаўчым камітэтам (УсеЦВК) і Саветам народных камісараў РСФСР (СНК РСФСР) была зацверджана пастанова «Аб парадку зацвярджэння і рэгістрацыі таварыстваў, не праследуючых мэтаў абагачэння», а 10 жніўня зацверджана інструкцыя да яе. Гэты дакумент вызначаў стан таварыстваў і саюзаў і парадак іх рэгістрацыі наступным чынам: ніводнае з таварыстваў (акрамя прафесійных саюзаў) не магло пачаць сваёй дзейнасці без рэгістрацыі ў НКУС і яго мясцовых органах; таварыства павінна было прадставіць у НКУС свой устаў, спіс членаў па адпаведнай форме, пратакол сходу аб стварэнні таварыства і заплаціць гербавы збор (100 руб.); таварыствы і саюзы, якія не зарэгістраваліся ў двухгадовы тэрмін пасля апублікавання гэтай пастановы, абвяшчаліся закрытымі.

Рэгістрацыя давала таварыству толькі афіцыйнае прызнанне для далейшага існавання на аснове закону. Пастанова аддзяляла дабрачынныя таварыствы ад тых, хто меў карысныя мэты. Аднак гэта не азначала, што дабрачынныя таварыствы не маглі весці гаспадарчую дзей-

насць: выдавецкую, энцыклапедычную, збіральніцкую, творчую, якая вымагала фінансавых сродкаў.

Услед за гэтым на Беларусі падобная «Інструкцыя па рэгістрацыі таварыстваў, саюзаў і аб’яднанняў» была прынятая СНК ССРБ 13 кастрычніка 1922 г. Менавіта гэтым дакументам кіраваліся Народны камісарыят асветы ССРБ, Народны камісарыят унутраных спраў (НКУС ССРБ) пры рэгістрацыі краязнаўчых арганізацый [7, с. 535–541].

Мінскае таварыства гісторыі і старажытнасцей згодна з патрабаваннямі прадставіла ў НКУС ССРБ спіс усіх членаў, свой устаў, звесткі аб гісторыі паходжання і план навуковых даследаванняў. Пасля абмеркавання НКУС звярнуўся з запытам у Дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне ССРБ (ДПУ ССРБ). Пасля таго, як з ДПУ прыйшоў адказ, што прычын для адмаўлення таварыству ў дзейнасці няма, НКУС выдаў Мінскаму таварыству гісторыі і старажытнасцяў ліцэнзію на далейшую дзейнасць [8, арк. 6].

Тая самая працэдура рэгістрацыі тычылася і іншых таварыстваў: Беларускага вольна-эканамічнага таварыства, Мінскага педагагічнага таварыства [9]. У фондзе Народнага камісарыята ўнутраных спраў ССРБ, а пазней БССР знаходзіцца вялікая колькасць дакументаў, якія тычыліся парадку рэгістрацыі грамадскіх добраахвотных таварыстваў і саюзаў, заяў на дазвол уставаў, пячатак, штампаў і інш. [9, 10, 11, 12].

12 мая 1923 г. Народныя камісарыяты юстыцыі, асветы і ўнутраных спраў падрыхтавалі нарматыўны (тыповы) устаў навуковых, літаратурных і мастацкіх таварыстваў, якія знаходзіліся ў юрысдыкцыі Наркамата асветы РСФСР. 9 мая 1924 г. была выдадзена пастанова ЦВК і СНК СССР «Аб парадку зацвярджэння ўставаў і рэгістрацыі таварыстваў і саюзаў, не праследуючых мэтаў абагачэння і распаўсюджваючых сваю дзейнасць на тэрыторыі ўсяго Саюзу ССР і аб наглядзе за імі», рэгламентуючая стан агульнасаюзных таварыстваў. З гэтага часу праекты стварэння саюзных таварыстваў павінны былі прадстаўляцца ў СНК СССР, а рэгістрацыя таварыстваў і нагляд за імі ажыццяўляліся НКУС саюзных рэспублік [12, с. 28].

Гэта пастанова змяніла шлях рэгістрацыі. Калі раней таварыства проста рэгістравалася, то цяпер яно падавала дакументы на дазвол з боку ўладаў. Усталяванне больш жорсткага кантролю над стварэннем і дзейнасцю таварыстваў, саюзаў, прымяненне адміністрацыйна-камандных метадаў у сферы кіраўніцтва пастутова прывяло да таго, што магчымасці да дзейнасці засталіся толькі ў тых дабрачынных таварыстваў, якія былі патрэбны савецкім уладам дзеля вырашэння тых ці іншых задач.

Гэтыя пастановы і інструкцыі на доўгі час з’яўляліся галоўнымі нарматыўна-прававымі актамі, якія рэгламентавалі дзейнасць савецкіх краязнаўчых таварыстваў.

У студзені 1922г. на базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі быў утвораны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). Перад Інбелкультам была пастаўлена задача арганізацыі планамернага вывучэння мовы, літаратуры, этнаграфіі, гісторыі, прыроды, эканомікі на тэрыторыі Беларусі. Вырашэнню гэтых задач на месцах маглі дапамагчы краязнаўчыя таварыствы, утварэнне і дзейнасць якіх з 1923 г. сталі больш інтэнсіўнымі.

У канцы 1923 г. на базе краязнаўчай камісіі было створана Цэнтральнае бюро краязнаўства. Асноўныя задачы дзейнасці ЦБК: арганізацыя краязнаўчых таварыстваў і агульнае кіраванне іх дзейнасцю, арганізацыя ўсебеларускіх канферэнцый па краязнаўству, збор музейных і іншых экспанатаў праз таварыствы краязнаўства і размеркаванне іх па Беларускім дзяржаўным музеі і яго аддзяленнях, выданне прац, праграмаў і анкет па краязнаўству. У склад прэзідыума ЦБК уваходзяць У. Пічэта (старшыня), А. Смоліч (намеснік), С. Скандракоў (сакратар), А. Азбукін і М. Дружчыц [13, с. 6].

Ва ўмовах з’яўлення цэнтра па кіраванні краязнаўствам Мінскае таварыства гісторыі і старажытнасцяў, якое з канца 1923г. не вяло актыўнай дзейнасці, прыпыніла сваю працу і самаліквідавалася, а многія з яго членаў пачалі супрацоўнічаць з ЦБК. Але вопыт краязнаўчай працы, метадычныя напрацоўкі таварыства не засталіся без увагі. Так, мадэль статута Мінскага таварыства гісторыі і старажытнасцяў легла ў аснову тыповага статута краязнаўчых арганізацый БССР.

**Заключэнне.** Такім чынам, на прыкладзе дзейнасці Мінскага таварыства гісторыі і старажытнасцяў бачна, што адносіны Савецкіх ўладаў і краязнаўчых арганізацый ў перыяд пачатку 1920-х гг. на тэрыторыі Беларускай рэспублікі развіваліся ў рамках агульнасаюзных тэндэнцый. Савецкімі ўладамі былі выпрацаваныя дзейсныя механізмы для кантролю (нагляду, уліку і рэгістрацыі) грамадскіх таварыстваў, значнае месца сярод якіх займалі краязнаўчыя арганізацыі.

Разам з тым карысць краязнаўчай справы для вырашэння задач эканамічнага і культурнага будаўніцтва дзяржавы была заўважана Савецкай уладай у Беларусі пазней, чым на тэрыторыі Расіі. Пра гэта сведчыць аказанне значна меншай падтрымкі фінансавым і арганізацыйным плане краязнаўчым арганізацыям у 1921–1922 г. Толькі ў канцы 1923 г. былі прыняты канкрэтныя меры па стварэнні адзінага арганізацыйна-кіраўнічага цэнтра краязнаўчымі арганізацыямі.

Дзяржаўная палітыка, такім чынам, у перыяд 1921–1923 гг. не спрыяла інтэнсіфікацыі навуко-

ва-даследчай дзейнасці і перашкаджала аб’яднанню краязнаўчых арганізацый. Неабходнасць знешняга нагляду абумоўлівалася шмат ў чым грамадска-палітычным становішчам, таму што ўлады як ў цэнтры, так і на месцах не мелі асаблівага даверу да актывістаў-краязнаўцаў, большая частка якіх складалася з асобаў навуковай і творчай працы.

**Літаратура**


1. Вяргей, В. С. Археалагічная навука ў Беларускай ССР 1919–1941 гг. / В. С. Вяргей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 144 с.
2. Алексеев, А. В. Археология и краеведение в Белоруссии. XVI – 30-е г. XX ст. / А. В. Алексеев. – Минск: Беларуская наука, 1996. – 206 с.
3. Каспяровіч, М. Краязнаўства / М. Каспяровіч. – Мінск: Бел. дзярж. выдавецтва, 1927. – С. 58–59.
4. Маслаковец, Н. Г. Краеведение в Белоруссии / Н. Г. Маслаковец // Краеведение. – 1923. – № 3. – С. 301–303.
5. Минское общество истории и древностей // Веснік Народнага Камісарыята асветы С.Р.Р.Б. – 1921. – № 2. – С. 40
6. Нацыянальны архіў рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 42. Воп. 1. Спр. 531. Народны камісарыят асветы ССРБ.
7. Соболев, В. С. Академия наук и краеведческое движение / В. С. Соболев // Вестник РАН. – 2000. – Т. 70. – № 6. – С. 535–541.
8. НАРБ. Ф. 34. Воп. 1. Спр. 170. Народный комиссариат внутренних дел. Устав и список членов Минского общества истории и древностей.
9. НАРБ. Ф. 34. Воп. 1. Спр. 165, 166, 170. Народный комиссариат внутренних дел.
10. НАРБ. Ф. 34. Воп. 1. Спр. 178, 179, 184. Народный комиссариат внутренних дел. О порядке регистраций обществ и союзов.
11. НАРБ. Ф. 34. Воп. 1. Спр. 205–207. Постановления, циркуляры и протоколы заседаний центральных учреждений БССР, приложения и уставы обществ и товариществ (проекты), присылаемые в НКВД БССР для обсуждения.
12. Скиданов, М. Е. Краеведческое движение 1920-х в Саратовской губернии как явление общественной и научной жизни региона [Электронный текст]. Дис. на соиск. ученой степени кандидата истор. наук. Саратов, 2004. Российская государственная библиотека, 2005. – (Из фондов Российской Госсударственной библиотеки). – Режим доступа: http://diss.rsl.ru/diss/05/ 0049 050049030.pdf.
13. Краязнаўчыя арганізацыі БССР // Наш край. – 1925. – № 1. – С. 6–10.